Магілёў: на Аляксандра Буракова склалі пратакол і будуць судзіць

Грамадства

30.09.2014

30 верасня незалежны журналіст з Магілёва Аляксандр Буракоў у чарговы раз наведаў Ленінскі РАУС горада Магілёва.



Алесь Буракоў. Фота з сайта spring96.org

Намеснік начальніка ААПП (аддзел аховы правапарадку і прафілактыкі) Ленінскага РАУС маёр Уладзімір Пугачоў азнаёміў журналіста з падрыхтаваным загадзя пратаколам аб адміністрацыйным правапарушэнні. Паводле датаванага 30 верасня дакумента, журналісту інкрымінуецца парушэнне часткі 2 арт. 22.9 КаАП – незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ. У пратаколе названы канкрэтны прыклад такой “незаконнай прадукцыі” – размешчаны на сайце DW.de («Нямецкая хваля») 25 жніўня 2014 года артыкул “Тропой контрабандиста: работают ли российские санкции в приграничье?” за подпісам Аляксандра Буракова.

У якаці сведкаў у пратаколе ўказаныя прозвішчы супрацоўнікаў з таго ж Ленінскага РАУС горада Магілёва.

Па словах Аляксандра Буракова, ён пазначыў у пратаколе, што не згодны з яго зместам, а таксама што змешчаны на інтэрнэт-сайце “DW” матэрыял ніяк не можа быць прадукцыяй СМІ, тым больш, што сам інтэрнэт-сайт не з’яўляецца сродкам масавай інфармацыі паводле беларускага заканадаўства, і ён сам не з’яўляецца штатным супрацоўнікам згаданага рэсурса.

Маёр Пугачоў паведаміў журналісту, што пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні будзе перададзены ў суд, куды Аляксандра Бураковы павінны выклікаць на судовае разбіральніцтва да 10 кастрычніка.

журналіста, а таксама адзін з сістэмных блокаў з кватэры яго бацькоў.
Другі сістэмны блок з кватэры бацькоў журналіста па-ранейшаму застаецца ў супрацоўнікаў Ленінскага РАУС, як і флэшкі.

Аляксандр Буракоў на простым лісце паперы напісаў маёру Пугачову распіску аб атрыманні тэхнікі. Адметна, што пры вынятку камп'ютараў супрацоўнікі міліцыі ніякага дакумента Аляксандру Буракову і яго бацькам не пакідалі.

Нагадаем, што раніцай 16 верасня ў прыватнай кватэры Аляксандра Буракова з санкцыі пракурора г. Магілёва супрацоўнікі Ленінскага РАУС правялі "агляд месца адміністрацыйнага правапарушэння". Падставай для яго правядзення стала з'яўленне ў ліпені-жніўні 2014 г. на інтэрнэт-сайце DW.DE ("Нямецкая хваля") трох матэрыялаў за подпісам Аляксандра Буракова. У выніку ператрусу, які фіксаваўся на відэакамеру, з кватэры забралі два ноўтбукі і дзве флэшкі. Пазней у той жа дзень на той жа падставе правялі ператрус у кватэры бацькоў журналіста, у часе якога забралі сістэмныя блокі двух камп'ютараў.

Аляксандр Буракоў 18 верасня накіраваў скаргі на дзеянні супрацоўнікаў Ленінскага РАУС горада Магілёва міністру ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Ігару Шуневічу і начальніку УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандру Кавальчуку. Таксама ім была накіраваная скарга на дзеянні пасадавых асобаў Ленінскага РАУС горада Магілёва і невядомых намеснікаў пракурора горада Магілёва на імя пракурора Магілёўскай вобласці.

Журналіст лічыць, што праведзеныя 16 верасня агляды і вынятак камп'ютарнай тэхнікі ў кватэрах яго і яго бацькоў былі здзейсненыя незаконна, і ўсе доказы, атрыманыя пры правядзенні гэтых працэсуальных дзеянняў, не маюць юрыдычнай сілы.

журналістаў за працу без акрэдытацыі на замежныя СМІ у тэтым пераліку – справы Алеся Дзянісава (штраф), Алеся Залеўскага(штраф), Аляксандра Буракова (дзве справы: адна – за сюжэт на “Белсаце”, магчыма, прыпыненая, другая – за матэрыялы на сайце DW.de), Міхаіла Аршынскага (за сюжэт на “Белсаце”, магчыма, прыпыненая), Віталя Сямашкі (закрытая), Марыны Маўчанавай(штраф) і Андрэя Мялешкі (дзве справы: па адной – штраф, другая будзе разглядацца ў судзе 2 кастрычніка).

Служба маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"

СМІ | суд | Магілёў | Аляксандр Буракоў

Хочаце ведаць больш? Сачыце за нашымі публікацыямі ў Telegram і Facebook!

АПОШНЯЕ НА САЙЦЕ

Навумчык: Літоўскі прэзідэнт мае права лічыць Беларусь хоць часткай Аргенціны

Сахашчык: Каліноўцы ў расійскім палоне жывыя!

503-ці дзень вайны: у Расіі забіваюць сваіх афіцэраў, Швецыя займела падтрымку

Уладзіміру Някляеву — 77! Размова з адным з лепшых паэтаў краіны

Афіцэр міліцыі, што пераследаваў людзей, скончыў жыццё самагубствам

Палёт над гняздом імпартазамяшчэння на «кукурузніку»

Хронікі рэпрэсій у Беларусі за 10 ліпеня

Расследаванне расследавання. Што не так з фільмамі "Беларускага расследавальніцкага цэнтра"?

Шчыраму патрыёту Беларусі Міраславу Лазоўскаму сёння споўнілася б 50

ЧЫТАЙЦЕ ТАКСАМА

Грамадства 26.09.2014

БАЖ выступіла з заявай у сувязі з перасследам журналістаў за супрацоўніцтва з замежнымі медыя

Грамадства 10.07.2023

Эпік фэйл. Лукашэнка адправіў чыноўнікаў па дэталі на закрыты завод-банкрут

Грамадства 01.06.2021

З Магілёўскага ізалятара вызвалілі журналістаў Буракова і Лапцэвіча. Яны заявілі пра здзекі ў турме

Грамадства 15.05.2021

Deutsche Welle: Рэжым прымае ўсё больш радыкальныя меры супраць

Грамадства

10.07.2023

За што беларусаў пераследавалі ў чэрвені

Грамадства 10.07.2023

Грамадства

10.07.2023

Ядзерная зброя ў Беларусі — блеф? Амерыканскія навукоўцы не знайшлі прыкмет яе размяшчэння

ПАЛІТЫКА

Палітыка 10.07.2023

Класкоўскі: Лукашэнка чакае вынікаў міжсабойчыка расійскіх персанажаў

Палітыка 10.07.2023

Культурныя прэзідэнты: як мастацтва стварае найлепшых кіраўнікоў дзяржаў

Палітыка 10.07.2023

«Здрада Эрдагана». Аб Пуціна ўжо выціраюць ногі

Палітыка

08.07.2023

«Заганнасць сістэмы ў Беларусі не апраўдвае дыпламатаў, але тлумачыць, чаму яны робяць тое, што робяць»

ЭКАНОМІКА

Эканоміка

10.07.2023

Высокі заробак, высокія інвестыцыі… А чаму людзі бягуць з працы?

Эканоміка

10.07.2023

Беларускі і расійскі рублі пасля бунту Прыгожына: чаго чакаць?

ЗАМЕЖЖА

Замежжа 10.07.2023

502-гі дзень вайны. Украіна праводзіць павольны контрнаступ адмыслова?

Замежжа 09.07.2023

Мігранты на ператрымцы. Дасье ў карыкатурах

Замежжа 08.07.2023

«Польшча — адзіная краіна, дзе беларусы могуць лёгка легалізаваць сваё знаходжанне»

Замежжа 08.07.2023

Бан для «Альтэрнатывы»?

Культура

10.07.2023

Не працаваў з часам, але апярэдзіў час. Нікола Тэсла — 10 фактаў да дня народзінаў генія

Культура

08.07.2023

Топ-10 фільмаў Тома Хэнкса, народнага актора Амэрыкі

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Повязь часоў

09.07.2023

Здраднікі або ахвяры гвалтоўнай дэпартацыі? Пра што маўчалі «остарбайтары»

Повязь часоў 09.07.2023

Наш Рэнесанс: Мікола Гусоўскі і «Песня пра зубра»

Повязь часоў 08.07.2023

Магдалена Радзівіл. Яна была спонсарам нацыянальнага адраджэння

Повязь часоў

07.07.2023

Цікавыя факты пра Льва Сапегу

АСОБА

Асоба

05.07.2023

Неўтаймаваны Юрка Лістапад

Асоба

02.07.2023

«Мы, былыя саўкі, такое праклятае племя...» Што Васіль Быкаў пісаў сябрам

СПОРТ

Спорт 10.07.2023

Ультрас байкатуюць матчы з 2020-га. Хто ходзіць на футбол?

Спорт 28.06.2023

Як беларусы на Кіпры адрадзілі футбольную каманду і прывялі яе ў чэмпіёны краіны

Спорт 23.06.2023

«МАК будзе шукаць кампраміс, каб дапусціць беларускіх і расійскіх спартоўцаў да Алімпіяды»

Спорт 10.06.2023

«Спорту па-за палітыкай няма. Гэта лукашысты кажуць, калі іх прышчучаць

© 2008-2023 Усе правы абароненыя

Выкарыстанне матэрыялаў дазваляецца пры ўмове спасылкі (для інтэрнэт-рэсурсаў — гіперспасылкі) на «Новы Час» Online

Скантактавацца з намі можна праз email або Telegram-бот

Рэдакцыя можа публікаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў